Мал
Ч0. 2ч0. 7290.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!



„Уступленне Чырвонай Арміі ў горад Мінск у 1920 г." З карціны мастака ордэнаносца Е. А. Зайцава, прадстаўленай у Маскве на выстаўцы выяўленчага мастацтва Беларускай ССР.

# РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ № 13

*Семен Кирсанов*

# Бессарабия — НАША

На курганах
 Троянова Вала,
от горячего ветра
 кренясь,—
Бессарабия,
 ты привставала,
чтоб увидеть
 хоть издали
 нас!
Но тебя
 отгоняли прикладом,
Чтоб не чуяла
 жизни другой,
чтобы подать несла
 землекрадам,
чтобы спину
 сгибала дугой.
Как тебя выжимали
 и пили,
 отбирали
 волов и улов!
Сколько глаз молодых
 ослепили!
Сколько сняли
 горячих голов!
Как губилось
 крестьянское детство!
Как раздулся
 боярский карман!
Как с надеждой
 смотрел
 на Одессу
сквозь лиманскую соль—
 Аккерман!
Бессарабия!
 Эта надежда
пропитала
 всю почву твою!
Кишенев,
 Измаил,
 Цыганешты—
возвращайтесь
 в родную семью!
Из беды,
 из неволи жестокой
возвращается
 к брату
 сестра,
возвращаются
 с песней
 притоки
к голубому теченью
 Днестра.
К нам идут
 виноградные кисти,
из-под обуха
 люди встают,
хлебом-солью
 встречают танкистов,
обнимают,
 целуют,
 поют!
О, как Черное море
 взмывало,
этой новостью
 небо слепя!
Красный флаг
 у Троянова Вала,
где Овидий
 бродил по степям!
О, какое мы время
 застали!
О, как радостна
певчая трель!
Как сияет на знамени:
 Сталин—
собиратель
 советских земель!
С Красной Армией
 танковым маршем
мы дунайскую тронем
 волну!
То, что искони
 кровное наше—
да не будет
 в чужом полону!
Вот летит
 трехмоторное чудо,
к небу тянутся
 стебли степей!
Бессарабия!
 вот—
 с парашютов
наши звезды
 слетают
 к тебе!

К.2 РКБ
КРАСНОАРМЕЙСКАЯ 9
ГОСБИБ.КЕ

# Годы росквіту і перамог

Дваццаць год таму назад доблесныя сыны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі назаўсёды вызвалілі сталіцу Совецкай Беларусі—горад Мінск, і астатнюю захопленую частку рэспублікі з пад прыгнёту белапольскіх акупантаў.

Дваццаць год. Многае за такі час можна забыць, але жахі і здзекі, нанесеныя насельніцтву белапольскімі бандытамі, ніколі не забудуцца. Жудасныя малюнкі пяражытага адна за другой устаюць у памяці. Белапольскія бандыты зверскі распраўляліся з насельніцтвам. Арыштоўвалі, расстрэльвалі дзесяткі тысяч людзей, якіх толькі падазравалі ў сімпатыях да комуністычнай партыі. У гарадах, мястэчках і вёсках ракой лілася чалавечая кроў. Праклятыя забойцы гвалтавалі жанчын, забівалі дзяцей. Вось адзін з многіх фактаў.

У вёсцы Кочэрычы, Бабруйскага павета група белапольскіх афіцэраў, абрабаваўшы сялян арганізавала бал. Потым афіцэры загадалі сялянам прывесці да іх сваіх жонак і дачок. Абураныя гэтымі наглымі здзекамі польскіх катаў, сяляне арганізавана выступілі і выгналі іх з вёскі. Назаўтра белапалякі абкружылі вёску і падпалілі яе з усіх бакоў. У вёсцы Кочэрычы было расстрэляна і загінула ў агні 200 жанчын і мужчын і дзяцей. Па няпоўным даным па тром толькі паветам (Барысаўскаму, Бабруйскаму і Ігуменскаму) колькасць пацярпеўшых ад зверств белапалякаў дасягае 160540 чалавек.

Вялікая комуністычная партыя і яе правадыры Ленін і Сталін ўзнялі беларускі народ на барацьбу са сваімі прыгнятальнікамі—польскімі панамі і памешчыкамі. Пры актыўнай дапамозе працоўных Чырвоная Армія ачысціла нашу зямлю ад ненавісных акупантаў.

Па заданню Цэнтральнага камітэта партыі работай па вызваленню Беларусі ад белапалякаў кіраваў асабіста таварыш Сталін і яго бліжэйшы саратнік Серго Орджанікідзе.

З велізарнейшым лікаваннем сустракаў беларускі народ сваю вызваліцельніцу—Чырвоную Армію. У газеце 16-й Арміі «Красноармеец» ад 15 ліпеня 1920 года таварыш Сталін пісаў: «Такіх адносін мне не прыходзілася сустракаць ні на ўсходзе, ні на поўдні. Не гледзячы на беднасць сялянскіх мас на Захадзе ў параўнанні з Паволжжам і поўднем, усё-ж сяляне дзяліліся апошнім з чырвонаармейцамі. Насельніцтва прыфрантовай паласы перанесла ўвесь цяжар польскай акупацыі, таму хораша сазнавала, чым пагражае яму ўварванне польскіх паноў.

На нашым фронце маецца цэлая група войск, уся санітарная справа якой знаходзіцца ў руках сялян і сялянак, праяўляючых велізарнейшыя клопаты да нашых раненых чырвонаармейцаў...

Што датычыцца настроя беларускіх сялян за франтавой паласой, то па нашым звесткам там адбываюцца сплашныя паўстанні, працуюць партызанскія атрады, разбураючыя тыл праціўніка, спальваючы склады і знішчаючы памешчыкаў».

Дваццатую гадавіну свайго вызвалення ад белапалякаў, беларускі народ святкуе ў адзінай з'еднанай сям'і. Доўгія годы нашы адзінакроўныя браты і сёстры Заходняй Беларусі таміліся пад гнётам панскай Польшчы. Яны гвалтоўна былі адарваны ад сваёй роднай краіны і пераносілі ўвесь жах капіталістычнай эксплаатацыі і памешчыцкага прыгнёта. Кнутом і шыбеніцай распраўляліся шляхецкія заправілы ў Заходняй Беларусі. Беларусам нельга было працаваць у дзяржаўных установах, гаварыць на роднай мове, вучыцца ў беларускіх школах. Лепшыя прадстаўнікі народа таміліся ў турмах і канцэнтрацыйных лагерах. Доблесная Чырвоная Армія працягнула руку брацкай дапамогі заходнім братам і вызваліла іх назаўсёды ад панскага мракабесся. Зараз працоўныя заходніх абласцей сталі роўнапраўнымі грамадзянамі Совецкага Саюза.

Непазнавальным стала за прайшоўшыя 20 год жыццё ў Совецкай Беларусі. Зруйнаваныя і спаленыя гарады і мястэчкі, нішчата і беспрацоўе, голад і хвароба—вось спадчына, пакінутая белапалякамі. Зараз усё гэта канула ў вечнасць. Пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна — Сталіна, пры актыўнай дапамозе рускага народа, БССР стала адной з перадавых рэспублік. Велізарны і неабдымны багацці яе. Тысячы новых фабрык і заводаў уведзены ў строй за гэтыя годы. У корані змянілася аблічча вёскі.

Сотні тысяч людзей вучацца ў рэспубліцы зараз у універсітэтах і тэхнікумах. Прайшоўшая з вялікім поспехам дэкада беларускага мастацтва ў Маскве паказала як высока ўзнялося мастацтва ў рэспубліцы.

Беларускі народ свабодна і радасна будуе сваё новае жыццё. Аб гэтым жыцці ён складае цудоўныя песні і казкі. Народ добра ведае, што партыя, урад, і асабіста таварыш Сталін штодзённа клапоцяцца аб палепшанні яго жыцця. Стаханаўскай работай на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва адказвае народ на гэтыя клопаты. Працаваць яшчэ лепш на блага сваёй радзімы—вось лозунг, з якім працоўныя з'еднанай Беларусі сустрэлі 20 гадавіну вызвалення БССР ад белапалякаў.

Другая імперыялістычная вайна з кожным днём усё больш і больш разгараецца. Нечуваныя бедствія і афяры прыносіць яна чалавецтву. Дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы міру беларускі народ разам з усімі народамі Вялікага Совецкага Саюза мае магчымасць спакойна жыць, вучыцца і адпачываць. Але працоўныя Беларусі ні на мінуту не забываюць указанні правадыра аб тым, што неабходна ўвесь народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці:

«Як ворану вышэй арла не лятаць,
Так ворагу нашай зямлі не таптаць».

У гэтых словах народнага паэта Янкі Купалы як нельга лепш выражаны пачуцці беларускага народа і яго гатоўнасць у любы час стаць на абарону заваёў Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Няхай жыве з'еднаны беларускі народ!

Няхай жыве бацька і друг беларускага народа родны Сталін!

# Сталіца

Летам горад прасынаецца разам з сонцам. Яшчэ толькі на ўсходзе першыя сонечныя праменні паказаліся на блакітным гарызонце, як жыццё ў горадзе ажыла. Прарываючыся скрозь расчыненыя вокны загаварыла радыё, змываючы сон бадзёрай гімнастыкай. З наскрозь адкрытых варот, адзін за другім, вымаляваныя ў розныя колеры, вышлі трамвайныя вагоны. Ва ўсіх канцах горада нястройным хорам загудзелі гудкі. У гэты-ж час у сонечныя ўтульныя палацы прышлі першыя мацеры і ўпаўне спакойныя, упэўненыя пакінулі на кіраўніц сваіх маленькіх дзяцей.

Перамяніліся змены на заводах. Пісьманосцы вышлі ў першую разноску пісем і газет. Загудзелі аўтамабілі на вуліцах. А сонца, якое час таму назад асвятляла горад часткамі, цяпер быццам падкінутае ўверх ззяла на ўсіх дахах многапавярховых дамоў. Бясстрашнае сонца ад усхода да захада працавіта і ўпэўнена робіць свой яркі шлях па нябеснаму мору ў гарачы ліпеньскі дзень.

Успомнім ліпеньскую раніцу 1920 года. Тады рашаўся лёс Мінска, які стагнаў пад ігам белапалякаў. Байцы 16 арміі натхнёныя Сталіным, які незадоўга перад тым пабываў на заходнім фронце, перайшлі ў наступленне і, выбіўшы ворага з Барысава, 8 ліпеня фарсіравалі срабрыстую Бярэзіну. Цяснімыя Чырвонай Арміяй белапольскія карпусы Доўбар-Мусніцкага і другіх такіх-жа незадачлівых генералаў пачалі спешна адыходзіць з адной пазіцыі на другую. Уначы з Мінска, увозячы нарабаванае, уцяклі чыноўнікі «дзяржавы польскай», услед за імі абозам пацягнуліся розныя вяльможы,—графы, князі. Гэта быў труслівы і разам з тым помстлівы пабег. З цэхаў або увозілі ўсё абсталяванне, або варварскі знішчалі яго на месцы, а фабрычныя будынкі падпальвалі. Пылала Ляхаўка. У музеях, зрываючы са сцен знішчалі, кралі каштоўныя карціны.

Авангардныя часці Чырвонай Арміі, яе гераічная 17 пяхотная дывізія ўжо была пад Мінскам. Выразна чулася гарматная страляніна. Вораг адчуваў сваю гібель у гэту апошнюю мінуту прабывання на захопленай зямлі. Белапольскае звяр'ё хацела нанесці яшчэ больш бяды і гора насельніцтву.

У турме сагналі ў адну камеру зняволеных большэвікоў і з вуглавога акна пачалі паліваць іх смяртэльным агнём з кулямёта. Скінулі з дзесятак бомб на пасажырскі вакзал і надоўга разбурылі яго, уводзілі паравозы, драпежніцка раскідалі чыгуначныя шляхі і нават не пашкадавалі праслаўтую конку.

Так завяршалі сваё дзесяцімесячнае ўладарства над Мінскам іезуіты, апранутыя ў ваенную форму.

Праклён вам, каты! Гэта яны паранілі горад, ператварыўшы ў папялішча яго лепшыя дамы і вуліцы.

Колькі жалезнай, вартай легендарнай славы, адвагі праявілі ў гэтым баі мінскія, барысаўскія, чэрвеньскія, маскоўскія, варонежскія комуністы і комуністкі, рабочыя, сяляне, беззаветная сваёй храбрасцю моладзь.

Кулямётчыца Клаўдзя Данкова ўрэзалася ў самую гушчу адступаючай польскай арміі, адкрыўшы неспадзяваны агонь, навяла ў радах ворага вялікую паніку. Пухавіцкі комсамолец Савва Барысюк з трыма таварышамі адбіў белапольскую гармату.

Калі з боку Барысаўскай сашы паказаліся першыя коннікі, пачаўся неапісальны малюнак. Расчыніліся вакяніцы, дзверы, вокны. Горад высыпаў на вуліцу. Ён лікаваў, ён таржаставаў, ён перажываў другое нараджэнне. На сонцы загарэліся чырвоныя сцягі, пунцовыя банты весела заблішчэлі на грудзях у людзей. Ніколі вуліцы так не лікавалі, як у гэтую раніцу.

Яшчэ за Мінскам ішлі баі, яшчэ не звярнуліся ў свае дамы мабілізаваныя металісты і гарбары, яшчэ раненыя не залячылі ран, якія атрымалі ў грамадзянскай вайне, а ў горадзе закіпела крапатлівая творчая праца. Весь горад выходзіў на суботнікі па аднаўленню чыгуначнага транспарта, увесь горад прымаў удзел у ачыстцы плошчаў, вуліц, двароў.

* * *

... У беластоцкай тэкстыльшчыцы старой ткачыхі Лідзіі Іванаўны Буравой ёсць у Мінску брат—столяр. Дваццаць два годы не бачыла ткачыха брата, дваццаць два годы не была ў Мінску і вось аднойчы чэрвеньскай раніцой 1940 года Лідзія Іванаўна вышла з вагона хуткага цягніка на перон Мінскага вак-



Помнік у парку імені Горкага ў горадзе Магілеве на магіле герояў грамадзянскай вайны, замучаных белапольскімі акупантамі ў 1920 годзе.
Фото А. Н. Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА).



Мінск—сталіца Савецкай Беларусі.
На здымку: Агульны выгляд універсітэцкага гарадка.
Фото М. Савіна (Фотахроніка БЕЛТА).

зала. Ужо на пероне для яе пачаўся дзень здзіўленняў і захапленняў. Перад ёй прыгажун-вакзал, а яна яшчэ помніць казарменнага выгляду стары будынак віленскага вакзала. Яе здзівіў трамвай, які замяніў чарапахавую конку. Ткачыха не магланалюбавацца Домам ураду, на месцы якога калісьці стаяў драўляны будынак гасцініцы «Бельгія». Бліскучыя асфальтам вуліцы, некалі ў часы губернатарскага Мінска пакрытыя вострым булыжнікам і пагніўшымі дошкамі. Лідзіі Іванаўне Буравой—ткачыхі з Беластоку—напэўна спадабаліся дзіўныя ператварэнні горада, які яна ведала з дзіцячых год. І гэта ўражанне было невыпадковым, было не мімалётна.

Горад удвая вырасшы (у Мінску было 125—140 тысяч насельніцтва—цяпер 250.000 з лішнім), горад, які стаў цэнтрам прамысловасці і культуры адраджонага народа,—ці-ж ён не можа пакарыць сваёй маладосцю, сваёй жыццерадаснасцю, сваім характарам.

Асабліва адчуваецца рост Мінска на ўскраінах гэтага старадаўняга, вядомага яшчэ 900 год назад, горада.

Ёсць у Мінску раён—Камароўка. Атрымаў ён сваю назву ад таго, што быў гэты раён самым балоцістым не толькі ў Мінску, але і ва ўсёй акрузе, мноства тут было камароў. Амаль да самага горада падступалі балоцістыя хмызнякі і лясы. Цяпер Камароўка захавала ад мінулага толькі сваё найменаванне. Ва ўсім астатнім гэта адраджоны раён горада, дзе кіпіць поўнакроўнае сталічнае жыццё.

Тут вырас упарадкаваны клінічны гарадок, тут-жа размясціліся карпусы Акадэміі Навук з прыгожымі калонамі. Велізарную тэрыторыю заняў батанічны сад, дзе вучоныя з вялікай любоўю вырошчваюць дзівосныя расліны. Пушкінская вуліца, якая перасякае Камароўку, па абодвух баках забудавана новымі палацамі, прамысловымі прадпрыемствамі.

У казачна хуткі тэрмін пабудаван радыёзавод—адзін з буйнейшых у Савецкім Саюзе. Тысячы інжынераў рыхтуе політэхнічны інстытут і гэта ў Мінску, дзе раней, акрамя некалькіх гімназій ды рамесленых школ, ніякіх другіх навучальных устаноў не было.

Тут-жа на Камароўцы знаходзіцца—фабрыка друку, дзе ў тысячах экземплярах друкуюцца творы любімых паэтаў і пісьменнікаў, пераклады на беларускую мову твораў класікаў марксізма, журналы, дзіцячыя кнігі, падручнікі.

На зялёным полі Усебеларускага стадыёна з рання да позняга вечара праводзіць свой вольны час, удасканальвае сваё спартыўнае майстэрства сталічная моладзь. Тысячы людзей адпачываюць у сасновым лесе парка культуры. І ўсё гэта адбываецца ў адной часці горада—Камароўцы.

Таксама відазмянілася Ляхаўка, прамысловая ўскраіна, далёка разраслася Старажоўка, дзе раней былі драўляныя домікі і жыла бедната. Стала непазнавальнай і Серабранка.

Бюджэт гарадской управы ў губернскім Мінску ледзь дасягаў паловы мільёна рублёў, а ў сталічным савецкім Мінску на адно новае будаўніцтва ў 1940 годзе будзе затрачана звыш 80 мільёнаў рублёў. У горадзе будуюць высокія прыгожыя дамы на 50 і больш кватэр, працягваюць упарадкоўваць вуліцы.

І ад гэтага сталіца з'еднанага народа набудзе яшчэ больш прыгожы, квітнеючы выгляд.

Маладая сталіца—горад-баец, горад-часавы.

**Е. Садоўскі.**



Мінск—сталіца Савецкай Беларусі.
На здымку: Спуск к парку імені М. Горкага на вуліцы імені Карла Маркса.
Фото Я. Якубовіча (Фотахроніка БЕЛТА).

РКБ Красноармейская 9

# Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

# аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў

Згодна прадстаўлення Усесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў—Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Павялічыць працягласць рабочага дня рабочых і служачых ва ўсіх дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемствах і ўстановах:

з 7 да 8 гадзін—на прадпрыемствах з сямігадзінным рабочым днём;

з 6 да 7 гадзін—на работах з шасцігадзінным рабочым днём, за выключэннем прафесій з шкоднымі ўмовамі працы, па спісках, зацверджаных СНК СССР;

з 6 да 8 гадзін—для служачых устаноў;

з 6 да 8 гадзін—для асоб, дасягнуўшых 16 год.

2. Перавесці ва ўсіх дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемствах і ўстановах работу з 6-дзёнкі на сямідзённы тыдзень, лічачы сёмы дзень тydня—нядзеля—днём адпачынку.

3. Забараніць самавольнае пакіданне рабочымі і служачымі дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама самавольны пераход з аднаго прадпрыемства на другое або з адной установы ў другую.

Пакіданне прадпрыемства і ўстановы, або пераход з аднаго прадпрыемства на другое і з адной установы ў другую можа дазволіць толькі дырэктар прадпрыемства або начальнік установы.

4. Устанавіць, што дырэктар прадпрыемства і начальнік установы мае права і абавязан даць дазвол на пакіданне рабочым і служачым прадпрыемства або ўстановы ў наступных выпадках:

а) калі рабочы, работніца або служачы згодна заключэння ўрачэбна-працоўнай экспертнай камісіі не можа выконваць ранейшую работу з прычыны хваробы або інваліднасці, а адміністрацыя не можа прадаставіць яму іншую падыходзячую работу ў тым-жа прадпрыемстве або ўстанове, або калі пенсіянер, якому назначана пенсія па старасці, жадае пакінуць работу;

б) калі рабочы, работніца або служачы павінен спыніць работу ў сувязі з залічэннем яго ў вышэйшую або сярэднюю спецыяльную навуковую ўстанову.

Адпускі работніцам і жанчынам служачым па цяжарнасці і родах захоўваюцца ў адпаведнасці з дзеючым законадаўствам.

5. Устанавіць, што рабочыя і служачыя, самавольна пайшоўшыя з дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемстваў або ўстаноў, перадаюцца суду і па прыгавару народнага суда падлягаюць турэмнаму зняволенню тэрмінам ад двух да чатырох месяцаў.

Устанавіць, што за прагул без уважлівай прычыны рабочыя і служачыя дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемстваў і ўстаноў аддаюцца суду і па прыгавору народнага суда караюцца папраўча-працоўнымі работамі па месцу работы на тэрмін да шасці месяцаў з утрыманнем з заработнай платы да 25 проц.

У сувязі з гэтым адмяніць абавязковае звальненне за прагул без уважлівых прычын.

Прапанаваць народным судам усе справы, указаныя ў гэтым артыкуле, разглядаць не больш, чым у пяцідзённы тэрмін і прыгавары па гэтых справах прыводзіць у выкананне неадкладна.

6. Устанавіць, што дырэктары прадпрыемстваў і начальнікі ўстаноў за ўхіленне ад аддання суду асоб, вінаватых у самавольным пакіданні прадпрыемства і ўстановы і асоб, вінаватых у прагулах без уважлівых прычын—прыцягваюцца да судовай адказнасці.

Устанавіць таксама, што дырэктары прадпрыемстваў і начальнікі ўстаноў, прыняўшыя на работу асоб, якія ўхіляюцца ад закона, самавольна пайшлі з прадпрыемстваў і ўстаноў, падлягаюць судовай адказнасці.

7. Гэты ўказ уваходзіць у сілу з 27 чэрвеня 1940 года.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.**

**Масква, Крэмль. 26 чэрвеня 1940 г.**

# На блага соцыялістычнай радзімы

Згодна пастановы Усесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выдаў указ «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на семідзённы рабочы тыдзень, і аб забароне самавольнага ўхода рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў».

З велізарным натхненнем рабочыя і служачыя сустрэлі гэта важнейшае рашэнне. На праходзіўшых мітынгах, рабочыя і работніцы і совецкая інтэлігенцыя адзінадушна заяўляюць, што яны гатовы выканаць любое рашэнне партыі і ўрада, каб зрабіць нашу квітнеючую краіну соцыялізма яшчэ больш магутнай, і яшчэ больш непрыступнай.

На самой справе навокал гарыць полымя вайны. Народы Еўропы і Азіі ўцягнуты ў крывепралітныя бойні. Толькі совецкая дзяржава ў рэзультаце мудрай палітыкі свайго ўрада паслядоўна абараняе справу міра.

Народ нашай краіны ні на мінуту не забывае, што нас не павінны пасцігнуць усякія нечаканасці. Вось чаму ён гатоў пайсці на любыя афяры, каб на ўсякія спробы ворагаў сунуць сваё свіное рыла ў совецкі агарод адказаць трайным ударам.

Не гледзячы на падоўжанне рабочы дзень у СССР па ранейшаму астаецца самым кароткім. У капіталістычных краінах рабочы дзень асабліва ў сувязі з ваеннымі падзеямі працягнут ад 10 да 14 гадзін. Мільённыя арміі беспрацоўных у Амерыцы, Англіі і другіх краінах блукаюць па вуліцах за пошукам работы.

Ад глыбіні душы гучаць словы выступаючай на мітынгу работніцы—стаханаўкі Мінскай фабрыкі імені Куйбышэва тав. Меерові́ч:

— «*Лішнія гадзіны работы на нашых прадпрыемствах,—гэта новыя магутныя танкі, быстраходныя самалёты і іншыя віды ўзбраення нашай слаўнай гераічнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі*—сказала яна.

Вацершчыца з Аршанскага ільнокамбіната, выказаўшы думкі і пачуцці ўсіх чэсных і адданых рабочых, работніц, на мітынгу заявіла:

Мы будзем чэсна выконваць і перавыконваць вытворчыя планы і нормы. Павелічэнне рабочага дня, стаханаўскія метады работы створаць краіне сапраўднае багацце ўсіх тавараў і прадуктаў і яшчэ больш узмоцняць магутнасць нашай любімай радзімы.

У аграмаднай большасці рабочыя і служачыя працуюць чэсна і добрасумленна. Яны працуюць над вынаходніцтвам новых норм і метадаў для ўзняцця прадукцыйнасці працы. Аднак мы маем яшчэ невялікую колькасць маладых рабочых і работніц, якія, карыстаючыся адсутнасцю беспрацоўя, парушаюць працоўную дысцыпліну, зняважліва адносяцца да ўстаноўленых законаў.

Лодыры, прагульшчыкі пералятаюць з аднаго прадпрыемства на другое, з адной установы ў другую, у пагоні за вялікім рублём, робяць бясконца прагулы. Сваімі антынароднымі дзеяннямі, яны перашкаджаюць нармальнай рабоце прадпрыемства, зрываюць работу чэсных рабочых.

Згодна Указа Вярхоўнага Совета СССР супроць такіх разбэшчаных людзей узмоцнены меры пакарання. Рабочыя і служачыя, самавольна пайшоўшыя з работы, аддаюцца пад суд і падвяргаюцца турэмнаму зняволенню. За прагул без уважлівых прычын прысуджваюцца да прымусовых работ.

Усе чэсныя рабочыя і работніцы з вялікім задавальненнем сустрэлі закон аб мерах пакарання лодыраў і прагульшчыкаў. У сваіх рэзалюцыях і выступленнях на мітынгах гучэлі словы:

Мы ганьбім лятуноў і прагульшчыкаў. Няма літасці зрыўшчыкам работы прадпрыемстваў, заводаў і фабрык. Гневам абурэння напоўнены сэрцы чэсных людзей супроць усякага, хто ўчыняе антынародныя справы.

Краіна і народ далей не можа цярпець, каб нядобрасумленныя работнікі дэзарганізавалі прадпрыемства і наносілі шкоду дзяржаве. Кожны совецкі грамадзянін абавязан чэсна і самаадддана працаваць на сваім пасту.

Пераход на 8-гадзінны рабочы дзень і на 7-дзённы тыдзень адкрывае велізарныя магчымасці роста прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску прадукцыі і вялікую эканомію выдаткаў.

Першыя дні работы па-новаму далі выдатныя рэзультаты. Так, напрыклад 4 цэх швейнай фабрыкі імені Крупскай, 25 чэрвеня выканаў дзённую норму на 115 проц., а ўжо 27 гэтага-ж месяца на 123,3 процанта. Альбо швейная фабрыка імені Дзяржынскага (горад Бабруйск) у першы дзень пасля Указа выканала план на 145,6 процанта.

Жанчыны Совецкай краіны на працягу ўсіх год існавання совецкай улады не раз даказвалі сваю любоў да радзімы, сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, сваю беззаветную адданасць комунізму. Гераізм, самаадданасць і высокі совецкі патрыятызм паказваюць жанчыны нашай краіны на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Можна не сумнявацца, што работніцы, служачыя і совецкая інтэлігенцыя і зараз пакажуць сябе, як палкія патрыёты радзімы і выканаюць да канца свой пачэсны абавязак у барацьбе за вялікую справу комунізма.

*„Працоўны чалавек адчувае сябе ў нас свабодным грамадзянінам сваёй краіны, свайго рода грамадскім дзеячом. І калі ён працуе добра, ён дае грамадству тое, што можа даць,—ён герой працы, ён авеян славай“ (Сталін).*

# АБАВЯЗАК І ЧЭСЦЬ

З напружанай увагай слухала я паведамленне на сходзе калектыва навуковых работнікаў Акадэміі Навук БССР аб звароце Усесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў.

Крывавы пажар другой імперыялістычнай вайны пылае ў большасці капіталістычных краін Еўропы і Азіі. З кожным днём вайна прыносіць усё новыя і новыя афяры. Прамысловасць, сельская гаспадарка, транспарт капіталістычных краін—усё падпарадкавана гэтай крывавай бойні. Няма амаль такога кутка на зямным шары, дзе-б гаспадарка краіны не была-б ахоплена ваеннай ліхарадкай.

Наш Советскі Саюз—адзіная соцыялістычная дзяржава, якая будуе шчаслівае і радаснае жыццё для ўсяго народа. Таварыш Сталін сказаў: «Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку»...

Указ Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і на сямідзённы рабочы тыдзень я горача вітаю. Я ведаю, што гэта неабходна ў інтарэсах усяго Советскага народа, у інтарэсах нашай любімай радзімы. Цяпер кожны рабочы, работніца, інтэлігенцыя і служачы дадуць краіне больш прадукцыі, больш танкаў, самалётаў, гармат і другога ўзбраення, якія зробяць нашу краіну неперамožнай і недаступнай для нашых ворагаў.

Цяпер я працую па падрыхтоўцы матэрыялаў да тэмы: «Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі». Гістарычныя дакументы, як жывыя людзі, расказваюць аб тым, з якой напружанасцю нашы бацькі і мацеры змагаліся і працавалі за Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю, за Советскую ўладу.

Я цяпер з асаблівым энтузіязмам і напружаннем працую над гэтым матэрыялам. За дадатковыя дзве гадзіны я паспяваю значна больш зрабіць і колькасна і якасна.

Першыя дні пасля Указа Вярхоўнага Совета паказалі, што нашы таварышы з усёй сур'ёзнасцю і свядомасцю аднесліся да гэтай пастановы.

**Н. І. Баргдановіч,**
навуковы работнік Інстытута гісторыі Акадэміі Навук БССР



Токар механічна-зборачнага цэха Гомсельмаша імені Л. М. Кагановіча А. Н. Петракова. За 1938-39 годы яна выканала норму на 187,5 проц., першая на заводзе перайшла на многастаночнае абслугоўванне. Працуючы на двух станках, выконвае норму на 300 процантаў.
Фото М. Савіна (Фотохроніка БЕЛТА).



Мітынг на швейнай фабрыцы „Кастрычнік" (Мінск), прысвечаны звароту ВЦСПС. Выступае памочнік майстра 3 цэха тов. Кузнец Ж. Г. Фото Рабіновіча.

# Работа па-новаму

Чацверты цэх швейнай фабрыкі «Кастрычнік» па выкананню вытворчых планаў і па якасці выпускаемай прадукцыі, лічыцца на фабрыке перадавым.

Як толькі радыё прынесла вестку аб звароце ВЦСПС і Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб падоўжанні рабочага дня і рабочага тыдня рабочыя і работніцы цэха пачалі працаваць яшчэ з большым вытворчым уздымам.

Павелічэнне рабочага дня на адну гадзіну дае магчымасць павялічыць выпуск прадукцыі ў мэтах умацавання гаспадарчай і абароннай магутнасці нашай краіны.

Першыя дні работы па-новаму паказалі высокую арганізаванасць і свядомую дысцыпліну ўсяго калектыва. У гэтыя дні не было ні аднаго выпадка спазнення, або невыхада на работу. Дакладна ў вызначаны час работніцы прыступілі да работы. У цэху адчуваецца асаблівы вытворчы ўздым. Значна павялічыўся выпуск прадукцыі кожнай работніцай паасобку і ўсім цэхам. Работніца плюшавай ленты Надзя Версоцкая ў першыя дні пасля выдання закона выканала норму на 160—170 проц., штодзённа яна дае прадукцыі 110—115 адзінак.

Соня Штэрн работніца шолкавай ленты выконвае норму выпрацоўкі на 150 проц. Работніца першай змены плюшавай ленты тав. Топельсон—на 150—160 проц.

У першы дзень пасля выдання пастановы чацверты цэх выканаў план на 107 працантаў, выпусціў 446 шаўковых плаццяў і блузак. Брыгада майстра Валошынай здала ў гэты дзень 94 плюшавых пальто, выканала план на 114,6 проц. Па старому плану фабрыка выпускала 2282 штукі вырабаў у дзень, 27 чэрвеня яна выпусціла 2716 штук—103,8 проц. новага плана.

Работніцы цэха ахоплены адным імкненнем дабіцца найвышэйшай прадукцыйнасці працы, павялічыць колькасць выпускаемай прадукцыі ў мэтах умацавання абароннай магутнасці Савецкага Саюза, у мэтах палепшання добрабыту працоўных мас.

**Хана Меламед,**
начальнік цэха

Мінск

# Вітаю Указ

Я, як і дзесяткі тысяч жанчын нашай соцыялістычнай радзімы, ад усёй душы вітаю Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень, на 7-дзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў.

Правядзенне ў жыццё гэтага Указа дае магчымасць дабіцца новых, дадатковых сродкаў для ўмацавання абароны нашай любімай радзімы, палепшыць матэрыяльнае становішча грамадзян соцыялістычнай краіны. Мы будзем працаваць так, каб наша краіна мела ўсё неабходнае ў дастатковай колькасці для яшчэ большай сваёй магутнасці.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР накіраван супроць лятуноў і прагульшчыкаў, супроць парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Людзей, якія імкнуцца ўрваць з дзяржавы пабольш, і не падпарадкоўваюцца працоўнай дысцыпліне, трэба бязлітасна караць.

Я працую на транспарце 18 год. Часта прыходзілася бачыць, якую шкоду наносяць лятуны і прагульшчыкі транспарту. Спазненне, або нявыхад на работу аднаго чалавека дэзарганізуе работу групы рабочых. У выніку марна траціцца некалькі гадзін. Выбіваюцца з графіка паязды, прастойваюць дзесяткі людзей і машын.

Ніякай літасці лодырам, рвачам і прагульшчыкам.

**Ф. М. Мусіч,** галоўны кандуктар пасажырскіх паяздоў.

Мінск.



Стаханаўка Бабруйскай панчошна-трыкатажнай арцелі імені XVI партз'езда комсамолка Е. А. Лук'янава, удзельнічае ў соцыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, сістэматычна выконвае норму на 140 працантаў.

Фото М. Шкляра (Фотохроніка БЕЛТА).

# НАС СЛУХАЎ ВЯЛІКІ СТАЛІН

## Незабыўнае ўражанне

Мы бязмежна шчаслівы. Нашы сэрцы перапоўнены пачуццем радасці, любві і ўдзячнасці роднай партыі і ўраду за аказаную нам чэсць. Мы—былыя прыгнечаныя, цёмныя, забітыя сяляне Заходняй Беларусі мелі вялікае шчасце быць удзельнікамі дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Гэта яшчэ адна радасная падзея ў жыцці нашага беларускага народа. Са сцэны Вялікага тэатра оперы і балета мы дэманстравалі перад кіраўнікамі партыі і ўрада нашы дасягненні ў галіне мастацтва за 10 месяцаў існавання совецкай улады. У заключным канцэрце мы выканалі беларускую народную песню «Пад калінаю» і песню, складзеную нашым харавым калектывам «Нам прислала Москва подкрепление». Гэта песня прысвечана гераічнаму паходу Чырвонай Арміі ў дні вызвалення Заходняй Беларусі.

У сваіх песнях мы расказалі працоўным сталіцы, кіраўнікам партыі і ўрада і асабіста таварышу Сталіну аб цяжкім мінулым беларускага народа, аб цяперашнім жыцці, поўным шчасця і радасці.

Нашы песні слухаў вялікі Сталін і доўга нам апладыраваў.

Пасля заключнага канцэрта нас запрасілі ў Вялікі Крэмлёўскі Палац, дзе адбыўся прыём удзельнікаў дэкады беларускага мастацтва. Мы былі ў Георгіеўскім зале. Там прысутнічалі правадыры партыі і ўрада на чале з таварышам Сталіным, члены ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Вярхоўнага Совета БССР, народныя камісары, героі Совецкага Саюза. Убачыўшы нашых кіраўнікоў мы плакалі ад радасці. Гэты гарачы прыём у Крэмлі астанецца памятным на ўсё жыццё.

**Ольга Праневіч, Марыя Федчык, Надзя Дуброўская.**

Баранавіцкая вобласць.



Група ўдзельнікаў танцавальнага калектыва Уойніцкага раёна, Палескай вобласці, якія прымалі ўдзел у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.
Фото Б. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

## Радаснае хваляванне

З пачуццем вялікага хвалявання ехала я на дэкаду беларускага мастацтва ў Маскву. З гэтым-жа пачуццем я выступала на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета, дзе дэманстраваліся нашы спектаклі. Мне прышлося два разы выступаць у балеце «Салавей». На адным з гэтых спектакляў прысутнічалі таварышы Сталін, Молатаў, Жданаў, Панамарэнка..

Якое гэта было вялікае свята для нашага калектыва. Словамі нельга перадаць радасці, якая перапаўняла нашы сэрцы. Было адно жаданне—усе сілы, увесь тэмперамент улажыць у танец і праз яго перадаць наша лікаванне.

У канцы спектакля таварыш Сталін горача нам апладыраваў. Мы ўсім калектывам, згуртаваўшыся зусім блізка ля ложы, бурнымі апладысментамі доўга, доўга выказвалі сваё захапленне і падзяку дарагому Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Гэты дзень у мяне і ўсяго нашага калектыва застанецца ў памяці на ўсё жыццё. Другі раз я бачыла таварыша Сталіна ў Крэмлі на прыёме ўдзельнікаў дэкады мастацтва.

Мне хочацца сказаць адно: хочацца жыць, хочацца яшчэ больш працаваць і ствараць новыя вобразы, хочацца, каб многа, многа год жыў дарагі таварыш Сталін.

Партыя і ўрад высока ацанілі мае труды ў галіне мастацтва. Мяне ўзнагародзілі ордэнам «Знак почета». Я вельмі ўдзячна за высокую ўзнагароду. Давер'е і ўвагу пастараюся апраўдаць чэснай і адданай работай.

**Александра Васільеўна Нікалаева,**
заслужаная артыстка БССР.

Мінск.



Лідзія Іванаўна Ржэцкая—заслужаная артыстка БССР, удзельніца дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.
Фото Я. Салавейчыка.

## ВЯЛІКАЯ ЧЭСЦЬ

З найвялікшай радасцю сустрэлі мы вестку аб узнагародзе работнікаў мастацтва: артыстаў, кампазітараў, мастакоў, удзельнікаў самадзейнасці ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Кіраўнік нашага гуртка Тацьяна Карнееўна Лапаціна ўзнагароджана ордэнам «Знак почета», лепшая ўдзельніца гуртка Матрона Макараўна Падуст узнагароджана пачотнай граматай Вярхоўнага Совета БССР.

Нашы песні слухаў вялікі друг народаў таварыш Сталін. Мы хваляваліся ад радасці. Нашы думкі і погляды былі накіраваны да таварыша Сталіна і яго саратнікаў. Кожны з нас стараўся, як найлепей выканаць сваю ролю і атрымаць добрую ацэнку.

Папулярнай беларускай народнай песняй: «Бывайце здаровы, жывіце багата...» быў закончан канцэрт.

**Софія Серак, Ефрасіння Лазарэвіч, Домна Чэчуга, Софія Аўсянік—**
удзельнікі хора.

Рэчыцкі раён.



Тацьяна Карнееўна Лапаціна—кіраўнік калгаснага самадзейнага хора Рэчыцкага раёна (Гомельскай вобласці), удзельніца дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, узнагароджаная ордэнам „Знак почета",
Фото А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

# У калгасе герояў

Сустракаць Анцілеўскага Браніслава Раманавіча вышлі ўсе калгаснікі, піонеры, моладзь, юнакі і дзяўчаты калгаса імені Леніна Кайкаўскага сельсовета, Мінскага раёна. Кожны імкнуўся хутчэй убачыць свайго аднавяскоўца — маладога лётчыка, удзельніка баёў з белафінамі; Героя Совецкага Саюза, Анцілеўскага. Кожнаму хацелася працягнуць яму руку, абняць як роднага і ад усёй душы падзякаваць за патрыятычны подвіг, за гераізм.

Шчаслівей за ўсіх была маці Мальвіна Іосіфаўна. Яна ганарыцца сынам, ганарыцца краінай, якая дала ёй магчымасць выхаваць яго.

На мітынгу Браніслаў Раманавіч расказаў землякам аб упартых баях з ворагамі фінскага народа, аб доблесці і гераізме Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, аб тым як ён, малады лётчык, неаднаразова ўдзельнічаў у смяротных схватках з варожымі самалётамі.

У адным з няроўных баёў, дзе сілы ворага былі значна большыя, тав. Анцілеўскі быў ранен у нагу. Сцякаючы крывёю, ён не выпусціў з рук кулямёта. Да апошняй мінуты трапна страчыў па самалётах ворага.

Тав. Анцілеўскі нарадзіўся за год да Вялікага Кастрычніка. Вучыўся ў Мінскім тэхнікуме Наргасвучота і адначасова набыў сабе ваенную спецыяльнасць,—без адрыва ад вучобы скончыў школу пілотаў пры Мінскім аэраклубе імені Молакава. Калі настаў дзень прызыва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, ён сам папрасіўся ў лётную часць. У хуткім часе лётчык-радыст тав. Анцілеўскі стаў героем у баях з белафінамі.

Званне Героя Совецкага Саюза атрымаў і другі калгаснік сельскагаспадарчай арцелі імені Леніна Матрунчык Іосіф Васільевіч. Тав. Матрунчык таксама лётчык. Яму прышлося 26 разоў удзельнічаць у баях з ворагамі. Яго пісьмы з фронта дыхалі бадзёрасцю. Ён ганарыўся тым, што яму прышлося выконваць адказную і пачотную задачу—удзельнічаць у баях па забеспячэнні безапаснасці слаўнага горада Леніна.



Маці Героя Совецкага Саюза Мальвіна Іосіфаўна Анцілеўская

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Леніна шчаслівы сваімі выхаванцамі-героямі. І яны добра памятаюць словы главы Совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава аб тым, што кожны павінен чэсна працаваць на сваім пасту і гэтым мацaваць магутнасць радзімы.

Сям'я Героя Совецкага Саюза Матрунчыка з'яўляецца прыкладнай у калгасе. Старэйшы яго брат Якаў—брыгадзір перадавой агародна-хмеляводчай брыгады. У 1938 годзе гэта брыгада атрымала па 10 цэнтнераў і 27 кілаграмаў хмелю з гектара, пры норме 4 цэнтнеры на гектар. У мінулым годзе атрымала 17 цэнтнераў. Тав. Матрунчык Якаў узнагароджан Малай сярэбранай медаллю.

Добрых поспехаў брыгада дабілася дзякуючы ўдарнай рабоце стаханаўцаў і стаханавак. Таварышы Марыя Кукальчык, Марыля Матрунчык, Марыля Зубчонак і Федосія Баран кожны дзень выконваюць нормы на 150—180 процантаў. Не мала стаханаўцаў ёсць і ў другіх паляводчых брыгадах, на фермах калгаса. Многія з іх сваёй чэснай працай удастоіліся ганаровага права быць удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі мінулага і гэтага года.

Калгас спаборнічае з суседнім калгасам імені Сталіна. Абодва калгасы ўпарта змагаюцца за першынства ў спаборніцтве. Нядаўна былі падведзены першыя рэзультаты і аказалася, што па многіх пунктах соцыялістычнага дагавора калгас імені Леніна ідзе ўперадзе.

Краіна ганарыцца сваімі героямі. Ганарацца імі і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Леніна. Яны ўпэўнены, што калі вораг толькі пасмее парушыць спакой совецкіх граніц—кожны працоўны паследуе прыкладу герояў.

**Ніна Елісеева.**



Калгасны рахункавод Е. Г. Панько—актывістка сельска-гаспадарчай арцелі імені Молатава, Брэсцкага раёна правяла вялікую работу сярод калгаснікаў па поўнаму ахопу падпіскай на пазыку.

На здымку: Е. Г. Панько прымае падпіску ў стаханаўкі Веры Добінскай.

Фото Лупейко (Фотахроніка БЕЛТА)

# Маладыя ўрачы

На трамвайнай астаноўцы каля Клінічнага гарадка многалюдна. Тут жыццё б'е ключом. Абкружаны натоўпам вясёлай жыццерадаснай моладзі, прафесар Мангейм у чаканні трамвая прыяцельскі гутарыць са студэнтамі.

Закончаны і падведзены вынікі многагадовай пладатворнай работы. Скончыліся экзамены апошняй групы выпускнікоў Медінстытута. Яны раз'едуцца па ўсёй краіне, узброеныя дасягненнямі перадавой медыцынскай навукі і стануць на варце народнага здароўя. Многія, якія паспелі здаць дзяржаўны экзамен, ужо выехалі на месца прызначэння. Астатнія хутка выязджаюць.

«Людачка, паздраўляю»,—чуецца радасны голас...

Людачка маладая дзяўчына. На спакойным твары свеціцца шчасцем вялікія вочы—«і табе таксама...» Моцны поціск рукі.

З другой групы даносіцца: «Дык не забудзь-жа адрас...— Пішы, абавязкова, пішы. Заедзеш па дарозе».

Садружаства, створанае доўгімі гадамі сумеснай упартай работы па аўладанні ведамі, сёння пры разлуцы праяўляецца асабліва ярка і чулліва.

Вось і пакой выдатнікаў. Пакой досыць вялікі, светлы, сонечны. Лёгкі непарадак, звычайны пры зборы ў дарогу. Складаюць рэчы, шыюць, гладзяць. Абменьваемся думкамі аб толькі што прайшоўшых дзяржаўных экзаменах. Я пацікавілася ці цяжка было здаваць. Задумаўшыся на секунду малады ўрач Людміла Паўлаўна Манько рашуча адказала: «Не, мы сур'ёзна работалі ўвесь час... Праўда, прышлося апошнія 2—3 месяцы пры паўтарэнні прыналегчы, папрацаваць па 16—18 гадзін у суткі».

Маладзенькая жывая брунетка падхапіла: «Пры гадавых экзаменах прафесары вельмі патрабавальныя. Калі адчуваюць, што студэнт адказвае няўпэўнена зачот не прымаюць. Інагды і па некалькі разоў адсылаюць. Прафесар Цітоў некаторых па сем разоў адсылаў»...

Падругі засмяяліся: «Ох, і злавалася-ж ты калі табе прышлося здаваць па два-тры разы».

— Злавалася—не злавалася, але затое цяпер ад душы ўдзячна. Ведаю, што справядліва. Падцягнулася, засвоіла грунтоўна, цяпер дзяржаўныя і «жыццёвыя» экзамены не страшны.

Прафесары патрабавальны, але правільна робяць,—такім было агульнае заключэнне.

— Студэнты займаліся калектыўна, групамі па тры чалавекі, а іншы раз усім пакоем паўтаралі. Дапамагалі адзін другому. Наш увесь пакой—выдатны,—усё здалі,—гаворыць малады ўрач тав. А. Гончарэк.—Здавалі на выдатна і добра. А лепш усіх Марыя Лукінішна Мяснікова. Яна круглая выдатніца.

Выпускнікі аб Мясніковай адзываюцца з любоўю і павагай. Яна маладая жыццерадасная дзяўчына. Займаючыся на выдатна, клапатліва дапамагала, падцягвала адстаючых таварышоў. Тав. Мяснікова кандыдат партыі. Працавала піонерважатым. Кіравала палітшколай. У часе выбараў ездзіла агітатарам на раён.

Ёсць сярод маладых урачоў і людзі пажылыя. Вось таварыш Фішман Ніхама Хонанаўна. Цяпер скончыла інстытут, а яе старшая дачка адначасова скончыла дзесяцігодку. Абедзве выдатніцы.

Тав. Фішман у мінулым работніца—краўчыха. Да 1932 года працавала на швейнай фабрыцы. Член КП(б)Б. Яна вяла вялікую грамадскую работу. З другога курса была членам парткома. Актыўна працавала ў прафкоме. Усе пяць год займалася на выдатна.

Вучоба закончана. Уперадзе новая жыццёвая работа, велізарная адказнасць.—Куды паедзеце на работу.—У Слуцк,—сказала тав. Манько.—Наогул большасць паедзе на раён. Амаль усе жанчыны нашага пакоя сялянкі. З калгасаў сюды прышлі і да калгасаў вернемся...

Маладыя ўрачы едуць на самастойную работу. Большасць участковымі урачамі. Да гэтай работы падрыхтаваны не толькі тэарэтычна, але і практычна. Практычныя заняткі праходзілі на працягу ўсяго курса. Апошнія два годы ў клінічным гарадку. У мінулым годзе ў часе летніх канікул працавалі ўрачамі ў клініках, кансультацыях пад наглядам вопытных урачоў, пад іх кантролем. Самастойна вызначалі дыягназ, прапісвалі лячэнне. Многія праходзілі практыку іменна там, куды едуць цяпер на работу.

496 новых урачоў—грамадскіх работнікаў, усебакова падрыхтаваных да велізарнай адказнай работы па ахове народнага здароўя выхаваў і даў краіне беларускі Медінстытут у гэтым годзе.

**В. Міхалеўская.**

Мінск.



Ваенурач 2 ранга А. Г. Варонін праводзіць заняткі ў гуртку па падрыхтоўцы медыцынскіх сясцёр з ліку жонак камандзіраў Н-скай часці БАВА.
(Фотахроніка БЕЛТА).

# У Беларускім павільёне

У Беларускім павільёне на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ярка і красачна адлюстраваны перамогі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі БССР. На экспанатах паказана, як Беларусь з адсталай непісьменнай краіны ператварылася ў індустрыяльна-аграрную квітнеючую краіну з перадавой машыннай тэхнікай і сельскай гаспадаркай.

З захапленнем высказваюць свае ўражанні ў кнізе водзываў наведвальнікі павільёна. Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі з горада Іркуцка піша: «Я ўражэнец БССР. 15 год пражываю ў Сібіры ў горадзе Іркуцку. Павільён БССР зрабіў на мяне вялікае ўражанне. Беларусь з адсталай раней краіны зрабілася непазнавальнай з высокаразвітай сельскай гаспадаркай і прамысловасцю. Рабочыя і калгаснікі Беларусі дабіліся гэтых перамог дзякуючы штодзённым клопатам нашага ўрада і асабіста таварыша Сталіна».

Значнае месца ў павільёне адведзена вядучай культуры сельскай гаспадаркі—ільну. Вялікая піраміда ўвешана зверху данізу кулі́ткамі высокаякаснага ільнавалакна. Тут дэманстрыруюцца поспехі лепшых калгасаў і перадавікоў ільнаводства. Вось экспанаты ордэнаносца Елізаветы Мітрафанаўны Вінаградавай, звеннявой калгаса імені Кірава, Кіраўскага раёна, Магілеўскай вобласці, атрымаўшай са свайго ўчастка ў сярэднім па 11,5 цэнтнера ільнавалакна з аднаго гектара.

Радам экспанаты звеннявой калгаса «Перамога», Шклоўскага раёна, Магілеўскай вобласці ордэнаносца Анастасіі Сямёнаўны Гаварковай. Яе звяно сабрала ў сярэднім за два годы ўраджай ільновалакна па 9,62 цэнтнера з гектара на ўчастку плошчай у 3 гектара.

Паказаны дасягненні калгаса «Брыгадзір», Аршанскага раёна, Віцебскай вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—1939 год на плошчы 35 гектараў ураджай ільнавалакна па 5,19 цэнтнера і насення па 5,66 цэнтнера з гектара.

«Беларуская ССР у ліку другіх саюзных рэспублік, — піша кандыдат сельскагаспадарчых навук,—займае віднае месца па культуры ільна-даўгунца і вытворчасці бульбы. У павільёне выстаўкі ярка паказаны дасягненні па гэтых двух культурах. За годы пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў БССР бурны росквіт атрымалі зернавыя культуры».

На трох стэндах прадстаўлены дасягненні зернавой гаспадаркі рэспублікі,—прадстаўлен ордэнаносны калгас імені Валадарскага, Магілеўскага раёна, які дабіўся атрымання высокіх ураджаяў дзякуючы прымяненню агратэхнікі і правільнай арганізацыі працы.

«Мы ганарымся сваімі адзінакроўнымі братамі,—пішуць у кнізе водзываў калгаснікі з Ленінскага раёна, Пінскай вобласці Касінскі, Турхановіч, Верэніч, Шчур,—якія пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў будуюць сваё шчаслівае жыццё».

Звеннявая па ільну калгаса «Ільіч», Полацкага раёна, Віцебскай вобласці, ордэнаносец Федора Аляксееўна Лапкоўская піша: «У павільёне паказаны ўсе нашы дасягненні, якія мы маем за апошнія годы па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі. Гэтыя дасягненні мы павінны замацаваць і ў далейшым змагацца за атрыманне яшчэ лепшых паказчыкаў нашай работы. Уражанні аб беларускім павільёне ў мяне застануцца на ўсё жыццё».

Беларускі павільён карыстаецца вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў і гэта зусім заслужана.

А. Фёдарава
Б. Рэгінбогіна



Знешні від павільёна Беларускай ССР. Фото Кіслова (Фотахроніка ТАСС).

# *Мары збыліся*



У былым памешчыцкім маёнтку графіні Красінскай цяпер арганізаван соўгас „Свіслач" (Гродненскі раён). Цяпер у доме графіні жывуць рабочыя соўгаса. З балкона дома раней любавалася прыродай графіня, цяпер-жа—работніца соўгаса Антаніна Іванаўна Чарнецкая.

Фото С. Грына

Калі мне было 19 год я папала ў турму. З невялікімі перапынкамі ад аднаго прыгавора да другога, прасядзела 8 год. У турме нарадзіла дачку. З першых дзён жыцця яна пазнала горач турэмнага рэжыму.

Цяжка ўспомніць, як у былой панскай Польшчы здзекваліся над намі—палітычнымі зняволенымі. Часта нас марылі голадам за тое, што мы, як палітычныя асуджаныя, не хацелі стаяць смірна перад начальствам. Асабліва нам даставалася ў дні рэволюцыйных свят. Ашалелыя турэмныя каты кідалі нас у карцэр і зверскі здзекваліся. Памятаю такі факт. У Равіцкай турме 15 лютага з нас сілай знялі сваю вопратку і прымусілі надзець крымінальную. Мы пратэставалі, кінулі гэтыя анучы і засталіся ў адных кашулях. Пратэст дорага каштаваў. Нас церзалі, прымушалі спаць на голых нарах. Так працягвалася да кастрычніка.

Пасля вызвалення былой Заходняй Беларусі ад польскіх паноў, для мяне, як і для ўсіх працоўных пачалося новае, шчаслівае жыццё. Працую на скурзаводзе № 2. Зарабляю 400 рублёў у месяц. Гэта для мяне і маёй дачкі ўпаўне дастаткова. Аб такой зарплаце я раней ніколі не магла марыць. Я шчаслівa, што карыстаюся самай дэмакратычнай ў свеце Сталінскай Канстытуцыяй. Мяне не палохае заўтрашні дзень. Дачка мая будзе вучыцца,—ёй прадстаіць выдатная будучыня.

**Дворская,**
былая палітзняволеная.
Беласток.

# ПЕРШЫ АДПАЧЫНАК

Упершыню тэкстыльшчыкі Беластока праводзяць свой водпуск у прыгожых здраўніцах рэспублікі. Лепшыя стаханаўцы, рабочыя-вылучэнцы, актывісты першага тэкстыльнага камбіната горада Беластока знаходзяцца ў доме адпачынку «Ніўкі».

За 19 год маёй работы на фабрыцы пры польскай уладзе я ніколі не карысталася водпускам. Рабочыя, якія працавалі нават і па 35 год, таксама не мелі права на адпачынак.

Працавалі мы ў самых цяжкіх умовах. Летам заліваліся потам у душных, цесных памяшканнях фабрык. Зімой цёмныя, сырыя прадпрыемствы падрывалі апошняе здароўе. Капіталісты за нашу цяжкую працу набівалі сабе кішэні грашыма і ездзілі за граніцу на дачы, спраўлялі балы, куцілі.

Цяпер мы працуем самі на сябе, на блага нашай радзімы, на блага народа. За сваю чэсную працу мы атрымліваем права на адпачынак. Добра адпачыўшы, мы зноў вернемся на свае прадпрыемства і з новымі сіламі будзем працаваць па-стаханаўску.

**М. Пятроўская,**
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Дом адпачынку „Ніўкі".

# Плады добрасумленнай працы

Дзесяць месяцаў назад я была беспрацоўнай. З дня на дзень хадзіла па гораду, шукаючы сабе работы. Як толькі Чырвоная Армія вызваліла працоўных Заходняй Беларусі, тысячы былых беспрацоўных атрымалі работу, у тым ліку і я.

Якое шчасце працаваць у роднай беларускай школе, бачыць вясёлыя твары дзяцей, радасць бацькоў.

Нядаўна ў нашай школе закончыліся іспыты. Гэта была радасная падзея ў жыцці вучняў. Большасць вучняў напісала пісьмовую работу на «выдатна». Па вусных прадметах адказы былі таксама добрыя і выдатныя. Іспыты ў школе прайшлі з вялікім поспехам.

Я шчаслівa, што ўжо бачыла добрыя плады сваёй работы. Гэтае шчасце магчыма толькі ў нашай краіне. Цяпер дзеці і настаўнікі адпачываюць. К новаму навучальнаму году прыдзем з новымі сіламі, з новай энергіяй і па-ўдарнаму возьмемся за вучобу.

**М. Макуцкая**
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.
Вілейская вобласць Радашковіцкі раён.



На воднай станцыі ў Друскеніках. Адпачываючыя катаюцца на байдарках.
Фото Е. Халдэя (Фотахроніка БЕЛТА).

М. Лупсякоў



# КРОЎ

*(Апавяданне)*

Васіль Сініца прачнуўся ад дзіўнага глухога гулу, што даносіўся з-за рэчкі. Ён высунуў з-пад коўдры галаву, прыслухаўся.

Але гул раптоўна сціх.

Сініца скінуў з сябе коўдру, апрануўся і вышаў на двор.

Была ясная вясновая раніца. На загарадзе, задраўшы ўгору паласаты хвост шчабятала сарока. Шэрыя канаплянікі бегалі па двары, штосьці выбіраючы з пачарнелай леташняй саломы.

Сініца прайшоў да сярэдзіны двара і застанавіўся. Ніякага гулу не было чуваць. «Ці то мне спрасонку здалося?»—падумаў ён, але ў гэты час нейдзе ўбаку грымнуў адзінокі гарматны стрэл. Яму адказала яшчэ некалькі.

Васіль Сініца ўбег у хату, пачаў будзіць жонку:

—Мар'я, чуеш—страляюць. Чырвоныя тут хутка будуць. Недалёка недзе бой,—і падышоў да акна.—Парсючка нашага палякі забралі. От як адступаць будуць, глядзі—карову забяруць. Дык я думаю, каб схаваць яе куды.

Мар'я ўсхапілася і пачала апранацца...

А тым часам у вёску ўязджалі дзве двуколкі. Следам за імі на вараным жарабцы ехаў польскі паручык, сухарлявы з невялікімі, як у сусліка, чорнымі вусамі на твары.

Двуколкі праехалі да сярэдзіны вёскі і застанавіліся супроць двара Васіля Сініцы.

— Чаго сталі? Заязджай!—крыкнуў паручык.

Жаўнер злез з двуколкі, адчыніў вароты...

Васіль зірнуў у вакно і твар яго пабялеў.

— Што-ж гэта будзе, Васіль! Ой ліха на іх! Чаму яны да нас чэпяцца?

Мар'я накінула на галаву хустку і вышла ў сенцы. Васіль дагнаў яе.

— У нас, Мар'я, крыху самагону ёсць. Пастаўлю я ім. От можа як і адкаснуцца.

Васіль вышаў на двор сустракаць няпрошаных гасцей.

— Заходзьце, паночку,—палахліва загаварыў ён да паручыка і падумаў: «Прынесла цябе нялёгкая!»

Паручык злез з жарабца, адшпіліў папругі ў сядле і аддаў повад жаўнеру.

— Трымай,—буркнуў ён.—Гаспадар, зараз-жа жар яешню! Ды падсмаж мне гуся ў дарогу!—крыкнуў ён Васілю.

— Няма ў мяне, паночку, гусей. Куры ёсць, дык от пеўніка можна будзе...

— Гуся смаж! Чуеш? Гуся, кажу! Не падсмажыш—галаву з плеч здыму.

Паручык пырскаў слінай. Ад недаспаных начэй твар яго хваравіта ўздрыгваў. Правай рукой ён хапаўся за шаблю.

Васіль маўчаў, ківаў галавой у знак згоды, думаў: «Шаблю выхваціць, дык я яго калком церабну» (непадалёк ляжаў моцны дубовы кол).

Але ўсё абышлося пакуль што добра.

Увёўшы жаўнераў у хату, Васіль, паставіў на стол бутэльку самагону, Мар'я прынесла спрэжанае сала.

— О, у цябе нават выпіць ёсць,—зарадаваўся паручык і наліў сабе першую шклянку.

— Гаспадар!—крыкнуў ён, калі ап'янеў.

— Што, паночку?

— Ідзі... дай коням сена.

— Добра, паночку.

Васіль вышаў у двор і накіраваўся да сенавала,—там засталося яшчэ крыху сена. Ужо ідучы адтуль з ахапкам, ён раптам пачуў у хаце лямант Мар'і. Акамянелы, Васіль застанавіўся. Сярод двара ён кінуў сена і пабег у хату. Паручык сярод хаты барокаўся з Мар'яй. Яна адбівалася ад яго, намагалася вырвацца.

Не кажучы ні слова, Васіль Сініца падскочыў да п'янага паручыка, размахнуўся і з усяе сілы ўдарыў яго ў твар. Паручык перакуліўся праз лаву і ўдарыўся галавою аб сцяну.

Жаўнеры навалііся на Васіля. Васіль спрабаваў вырвацца, але не мог. Яму звязалі рамянём рукі і паваліді на падлогу.

Ускочыўшы, збіты паручык закрычаў:

— Большэвік, пся-крэў!—і з пагардаю ўдарыў Васіля ботам у твар. З рота Васіля палілася кроў.

— У штаб яго!—загадаў раззлаваны паручык.

Васіля Сініцу выцягнулі з хаты і ўзвалілі на двуколку. Адзін з жаўнераў стрэліў у гару. Па вуліцы прабегла жанчына, залемантавала. Крык гэты і стрэл абудзілі вёску. З двароў выбягалі спалоханыя людзі. Прыбег на васілёў двор рыжы, як восень, вясковы поп айцец Афанасій.

— Пане паручык! Чаго-ж вы да мяне не заехалі?—і нагнуўшыся да паручыкава вуха зашаптаў штосьці. Паручык матнуў галавой у знак згоды. Поп, гэтак-жа хутка, як і з'явіўся, знік з двара.

Тым часам на вуліцы паказаўся стары дзядок Янэк. З невялікім сукаватым кіёчкам ён, прыкульгваючы на левую нагу, ішоў да сініцынага двара. Да дзеда далучылася яшчэ некалькі вяскоўцаў. Выбягалі з двароў жанчыны. Натоўп рос з кожнай хвілінай і ішоў палахліва, баючыся, што палякі пачнуць страляць. Уперадзе ўсіх ішоў Янэк. Ён трос сівой барадой, размахваў кіёчкам, падбадзёрваў:

— Не бойцеся, браткі. Праўда яна возьме верх...—Двуколкі ў гэты час ужо выехалі з сініцынага двара і застанавіліся на вуліцы. Сухарлявы паручык трымаў варанога жарабца за повад і глядзеў сабе пад ногі. У нагах галасіла Мар'я:

— Паночку, даруй мне. Адпусці яго. Васіля. Ох, божа ты мой... Васілё-о-чак!..

Паручык замахнуўся нагою і ўдарыў у Мар'ін твар брудным ботам. Жанчына войкнула і расцягнулася на сырой зямлі. З яе рота і носа цякла кроў.

Якраз у гэты час і падыйшоў да двуколкі Янэк. Натоўп абступіў жаўнераў, шумеў.

— Разыйдзіся-а!..—закрычаў паручык. Ён ускочыў у сядло, выхапіў з кабуры рэвальвер.

Натоўп сціх.

— Бунтаваць, пся-крэў?—лаяўся паручык.—Волі хочаце, гады!—паручык падняў на дыбы жарабца і накіраваў яго на людзей.

З двуколкі хрыпеў Васіль:

— Суседзі, не пакідайце дзяцей. Дапамажыце ім, сіротам...

Дзядок Янэк забег наперад паручыкава жарабца, схапіў яго за цуглі.

— Хлопцы, чаго глядзіце! Біце іх!—закрычаў ён, і падняўшы свой сукаваты кіёчак, секануў ім паручыка. Паляцела ў жаўнераў колле.

— Палякі!—крыкнула ў гэты час нейкая жанчына.

І сапраўды, па вёсцы галопам няслішся коннікі. Кінуліся людзі, хто куды. Апошнім бег дзед Янэк. Ужо каля самага двара нагнала яго паручыкава куля. Дзед узмахнуў кіёчкам і расцягнуўся на зямлі...

Запалала вёска. Едкі дым віўся ўгару, рыжыя языкі полымя лізалі саламяныя стрэхі. Калі двуколкі падымаліся на гару, Васіль Сініца добра бачыў, як гуляў «залаты певень».

Жаўнер казаў паручыку:

— Ваша благароддзе! Дзеля чаго мы яго вязем?

Двуколкі застанавіліся.

— Гані далей—нездаволена бурчэў паручык.—Доўгагрывы лайдак казаў мне, што гэты ведае пра партызанаў...

У паручыка былі свае планы. Калі ён толькі вязе чалавека, ад якога можна будзе што-колечы дазнацца, як казаў яму поп, то паручык зможа выслужыцца...



КРАСНОАРМЕЙСКАЯ 9

# Акушэрка

Не гледзячы на 54-гадовы ўзрост яна бадзёрая, рухавая і вясёлая. У любы час, у любое надвор'е яна па выкліку, нават і не ў час дзяжурства, прыходзіць у радзільнае аддзяленне бальніцы, альбо кватэру рожаніцы.

У раёне добра ведаюць акушэрку Любоў Аляксееўну Шастакову. Паважаюць яе жанчыны-мацеры. У радзільным аддзяленні Іолчанскай бальніцы рожаніцы акружаны павагай і клопатамі. Нядаўна споўнілася 30 год як тав. Шастакова працуе акушэркай у Камарынскім раёне.

Вось што расказвае Шастакова аб сабе і сваёй рабоце.

— Па сканчэнні Магілеўскай павівальнай школы ў 1910 годзе я прыехала ў Іолчу на фельчарскі пункт, да рэчы ён ва ўсёй воласці быў адзіным. Бальніцы тут наогул тады не было. Да майго прыезду сялянкі нават не ведалі, што такое акушэрка. Жанчыны былі цёмныя, забітыя, непісьменныя. Рожаніц лячылі бабкі-павітухі. Спачатку жанчыны мяне дзічыліся, а бабкі разводзілі розныя плёткі, хлусню. Хадзілі па вёсцы і нашэптвалі ўсялякія небыліцы.

— Работу,—прадаўжае тав. Шастакова,—я распачала з таго, што калі ў святочныя дні, на прызбе хаты сядзела некалькі жанчын, я ішла да іх, заводзіла гутарку з імі, растлумачвала сваю работу акушэркі. Даказвала шкоду, якую наносяць рожаніцам бабкі-павітухі. З цягам часу сярод жанчын знайшліся мае прыхільнікі. Пачала я вывучаць іх быт і жыццё. Завязалася некаторая дружба. Жанчыны пачалі прыходзіць да мяне за парадамі, запрашалі ў часе родаў.

У стары час даводзілася бачыць дзікія сцэны, якія адбываліся на кватэрах рожаніц. Прыходзілі дзве-тры шаптухі, якія бясконца маліліся над ложкам рожаніцы, клалі на яе ікону, даходзіла да таго, што рожаніцу прымушалі скакаць праз брудную бялізну мужа. Асабліва памятаю такі факт. Я паехала да рожаніцы Аўраменка за 18 кілометраў у вёску Крукі. У жанчыны былі цяжкія роды, а бабкі падвесілі рожаніцу да столі, калі-ж з'явілася я, яны сустрэлі мяне няветліва.

У 1914 годзе ў гэтай-жа самай вёсцы Круках быў такі выпадак. Я прыехала да рожаніцы Ефіменка. Рыхтуючыся агледзець яе, пачала мыць рукі над тазам і ўбачыла ў ім ручку дзіцяці, якую адарвалі бабкі. Мне прышлося зрабіць жанчыне аперацыю. Праўда, дзіця было ўжо мёртвым,—яго замучылі бабкі і адарвалі руку.

Зараз аб такіх фактах успамінаеш як аб далёкім мінулым. Маці ў Савецкім Саюзе акружана небывалымі клопатамі. Жанчыны ўжо не вераць у забабоны павітух. Медыцынскім абслугоўваннем карыстаюцца працоўныя і яно прыбліжана да іх.

Зараз у мястэчку Камарына ёсць радзільны дом, які абслугоўваюць кваліфікаваныя спецыялісты—урачы і акушэркі. Пры Іолчанскай бальніцы ёсць радзільнае аддзяленне на 9 ложкаў. У раёне адкрыты рад фельчарскіх пунктаў, якія здольны ў суткі абслужыць каля ста рожаніц.

Любоў Аляксееўна не абмяжоўваецца работай акушэркі бальніцы. Яна вядзе і вялікую грамадскую работу. Часта ў вёсках яна чытае лекцыі аб ахове здароўя мацеры і дзіцяці, на якія збіраюцца сотні калгасніц, каб паслухаць яе.

За апошнія годы Любоў Аляксееўна ў Капоранскім і Іолчанскім сельсоветах падрыхтавала з ліку калгаснікаў звыш 200 значкістаў ГСА.

**С. Сердзюкоў.**

Камарынскі раён.



Кіраўніца гуртка мастацкага вышывання пры Пінскім палацы піянераў Р. А. Гамбург навучае піянераў Мілю Лур'е, Сіму Фрыдліну і Люсю Фрыдман мастацтву рукадзелля.
Фото Е. Халдэя (Фотахроніка БЕЛТА).




17 і 18 чэрвеня гг. ў Мінску праходзілі ўсебеларускія спаборніцтвы па веласіпеду. У спаборніцтвах прымалі ўдзел 60 лепшых веласіпедыстаў рэспублікі. На здымку: Тав. Грышан (Орша)—пераможца, заняўшая першае месца на 20 кілометраў па шасе на дарожнай машыне.
Фото І. Рабіновіча.

# Парады ўрача

## Летнія дзіцячыя паносы

Летнія паносы ў дзяцей і цяпер наглядаюцца часта. Таму органы аховы здароўя многа займаюцца пытаннем іх папярэджання.

У гэтым артыкуле мы пазнаёмім чытачоў з тым, што такое летнія паносы і чым яны выклікаюцца.

Паносы ў дзяцей выклікаюцца ў выніку праглатвання разам са стравай ці ў выніку занясення з бруднымі рукамі і цацкамі мікробаў.

Летам пры высокай тэмпературы мікробы добра развіваюцца. Асабліва спрыяючая абстаноўка для развіцця мікробаў ствараецца ў рэштках стравы, ці ў страве, якая хаваецца ў цёплае месца.

Кармленне недобраякаснай стравай: скісшым ці некіпячоным малаком, перакармліванне, недакорм і кармленне стравай, якая не адпавядае ўзросту дзіцяці можа выклікаць панос, таму што страўнік дзіцяці не здолен пераварыць гэту страву.

Пераграванне дзяцей на сонцы ці празмернае хутанне і ўкрыванне выклікае ў маленькіх дзяцей паносы, з-за страты тканямі арганізма вады.

Мікробы, якія выклікаюць панос могуць быць занесены мухамі на страву, на цацкі, на рукі дзіцяці, і такім чынам папасці дзіцяці.

Панос можа пачынацца паступова, калі прычына выклікаючая яго дзейнічае на працягу доўгага часу.

Панос можа наступіць востра, сярод поўнага здароўя дзіцяці, калі прычына выклікаўшая яго была моцнай і дзіця не магло з ёю справіцца.

Дзіця, якое да гэтага было здаровым, пачынае часцей мець стул, спражненні робяцца вадкімі, зялёнымі з прымессю белых камячкоў, якія складаюцца з няўсвоенай стравы (малака і вапнавых салей) вельмі важных для дзіцячага арганізма і страчваемых дзіцём у часе паноса.

Дзеці робяцца вялымі, сумнымі, капрызнымі, худзеюць, губляюць у вазе. Скура робіцца сухой, збіраецца ў складкі. Пры прыняцці мер састаянне дзіцяці паляпшаецца, у праціўным выпадку панос робіцца хранічным і гэта лёгкая форма можа весці да цяжкіх вынікаў.

Другая форма (цяжкая таксічная дыспепсія) наступае адразу, разам з паносам з'яўляюцца ваніты. Пасля прыёма стравы, пасля прыёма нават двух лыжачак вады могуць быць ваніты, дзіця робіцца вялым, ці неспакойным, бледным, вочы ўвальваюцца, нос завастраецца, скура сухая збіраецца ў складкі. Дзіця губляе ў вазе ў выніку страты вадкасці спражненнямі, скуравым дыханнем і ванітамі.

Трэці від паносаў—гэта каліт, характарызуецца частым стулам са слізззю. Дзіця натужваецца, задне-праходная адтуліна па гэтай прычыне раздражнена і зіяе (не сціскаецца). Каліт праходзіць з ванітамі і працякае як таксічная дыспепсія. Становішча дзіцяці цяжкае.

Часта ў спражненнях дзяцей хворых калітам з'яўляюцца пражылкі крыві ў большай ці меншай колькасці.

Каліты большай часткай у 70—80 проц. выпадкаў выклікаюцца дызентэрыйнай палачкай і таму трэба лічыць усякі каліт інфекцыйным захворваннем і ізаляваць хворых дзяцей ад здаровых.

Нават лёгкія паносы могуць выклікаць у дзяцей цяжкія вынікі, а таму вельмі важна папярэдзіць іх.

Меры прафілактыкі летніх паносаў:

Пераграванне дзяцей выклікаюць паносы.

Летам трымайце дзяцей у цяні, апранайце лёгка ў распашонку ці трусікі, не хутайце дзіця.

Мацеры! Кarміце дзяцей да 6 месяцаў толькі груддзю, не аднімайце ў вясенне-летні перыяд ад грудзі, нават калі дзіця старэй года.

Грудзь давайце дзіцяці праз пэўныя прамежкі часу: да 3 месяцаў праз 3 гадзіны, пасля 3-х месяцаў праз 3 з паловай гадзіны—4 гадзіны. У прамежках паміж кармленнем давайце дзецям піць гатаваную ваду.

**Соскіна—**
асістэнт клінікі Інстытута Аховы мацярынства і дзяцінства

## Бактэрыяфаг—лячэбны сродак ад паносаў

I. Прымаецца бактэрыяфаг як з прафілактычнай, так і тэрапеўтычнай мэтай у дазіроўцы: Для дарослага чалавека—5 куб. см.

Дзяцей да 3 год—1 куб. см.

Ад 3 год да 12 год—3 куб. см.

Ад 12 год—як даросламу.

Прымаецца бактэрыяфаг праз рот на 3-працантнай содавай вадзе.

II. Прымяненне яго з прафілактычнай і лячэбнай мэтай:

Людзям, якія знаходзяцца ў акружэнні перахварэўшага дызентэрыяй (у сем'ях, дзе меліся зімовыя ці вясновыя захворванні дызентэрыяй) фаг даецца трохкратна з 5—7-дзённымі прамежкамі ў дазіроўцы, указанай у параграфе I.

У эпідэмічны час у мэтах папярэджвання захворвання асоб, усім пражываючым з хворым у адным памяшканні даецца аднаразова доза, указаная ў параграфе I.

У выпадку з'яўлення на гэтых-жа аб'ектах новых захворванняў, дачу фага трэба паўтарыць.

III. Фаг даецца два разы наташчак (за 2 гадзіны да ежы) на працягу сутак (уначы і раніцой).

Дапускаецца таксама і паўтарэнне дачы фага ў выпадку адсутнасці эфекта.

IV. Фаг павінен быць зусім празрыстым. Калі пры праверцы на свет у ампуле памутненне хаця-б невялікае, то ён лічыцца нягодным.

Ускрытая ампула павінна быць скарыстана на працягу не больш 2—3 гадзін.

Увага. Пры выліванні фага з ускрываемай ампулы—могуць пападаць кавалачкі шкла. Неабходна перад ужываннем асцярожна зліць яго ў другую лыжку.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН
Адрас рэдакцыі: Мінск, Савецкая, 49, 1 паверх.
Друкарня імя Сталіна. Зак. № 2568. Тыраж 13.000 экз. Уп. Галоўліта БССР № Б—2838.
Здана ў друк. 8/VII—40 г. Падпісана да друку 16/VII—40 г. У нумары $2^1/_2$ друк. арк. 120.140 друк. знак.

**ЦАНА 20 кап.**



К-2 РКБ
КРАСНОАРМЕЙСКАЯ 9